УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 069:908]:069.12+351.853/855-043.96(043.3)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**БАМБЕШКА**
**Іванна Іванаўна**

# КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ ПА АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя
гісторыка-культурных аб’ектаў

Мінск, 2021

Работа выканана на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Бяспалая Марыя Аркадзьеўна**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Плытнік Кацярына Генадзьеўна**, кандыдат культуралогіі, галоўны спецыяліст аддзела спорту і турызму Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта

Апаніруючая арганізацыя: **Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»**

Абарона адбудзецца 30 верасня 2021 г. а 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі ўніверсітэта; e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара: 364-77-01.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 30 жніўня 2021 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт Т. М. Бабіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Распаўсюджанне масавай культуры як праяўленне працэсаў глабалізацыі паставіла пад пагрозу захаванне індывідуальнасці і прывяло да так званага крызісу нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці як асобнага чалавека, так і грамадства ў цэлым. Паколькі ўсведамленне ідэнтычнасці грунтуецца на паглыбленні гістарычнай памяці, то пераадоленне крызіснай сітуацыі магчыма праз актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны. У падобных умовах музей як культурная форма, гістарычна выпрацаваная чалавецтвам для захавання і актуалізацыі найбольш каштоўнай часткі спадчыны, з'яўляецца важным сродкам у фарміраванні культурнай ідэнтычнасці і нацыянальнай самасвядомасці. У дысертацыйным даследаванні тэрмін «актуалізацыя» разглядаецца як *дзейнасць па захаванні і ўключэнні культурнай і прыроднай спадчыны ў сучасную культуру шляхам актывізацыі сацыякультурнай ролі яе аб'ектаў і іх інтэрпрэтацыі*. Актуалізацыя спадчыны ажыццяўляецца сродкамі культурна-адукацыйнай, экспазіцыйна-выставачнай і навукова-фондавай дзейнасці музея. Найбольш эфектыўна гэты працэс адбываецца праз рэалізацыю культурна-адукацыйнай дзейнасці, паколькі ў дадзеным выпадку перадача культурна значных сэнсаў адбываецца праз пасрэдніка, здольнага данесці да наведвальніка не заўжды зразумелую яму мову музея. Прызнанне гэтага факта выклікала неабходнасць звярнуцца да аналізу культурна-адукацыйных практык айчынных музеяў па ўключэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру.

У працэсе захавання і трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны выключная роля належыць краязнаўчым музеям. Неабходна вызначыцца з паняццямі «краязнаўчы музей», «мясцовы музей» і «рэгіянальны музей». У айчыннай музеялогіі тэрмін «краязнаўчы» ўжываецца пры класіфікацыі музеяў па профілі, пад якім мы разумеем *яго спецыялізацыю, абумоўленую сувяззю з канкрэтнай навукай ці відам мастацтва, тэхнікай, вытворчасцю і яе галінамі*. На падставе такога крытэрыя вылучаюць комплексныя музеі, дзейнасць якіх звязана з некалькімі навуковымі дысцыплінамі ці галінамі ведаў. Самай шматлікай групай сярод іх з'яўляюцца краязнаўчыя, зборы якіх дакументуюць розныя бакі жыцця пэўнай мясцовасці. Катэгорыі «рэгіянальны музей» і «мясцовы музей» утвараюцца пры структураванні музейнай сеткі па маштабе дзейнасці, калі вылучаюць музеі цэнтральныя, рэгіянальныя і мясцовыя. У даследаванні аналізуюцца рэгіянальныя і мясцовыя краязнаўчыя музеі, якія дзейнічаюць у сістэме Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і ўтвараюць самы значны сегмент музейнай сеткі (53,4 % ад агульнай колькасці). Краязнаўчыя музеі выконваюць місію захавання гісторыка-культурнай спадчыны канкрэтнага, тэрытарыяльна абмежаванага сацыякультурнага асяроддзя, з'яўляючыся яго актыўным кампанентам. Такім чынам, актуальнасць даследавання абумоўлена неабходнасцю выявіць перспектыўныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў па ўключэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыя выканана ў межах праграм даследаванняў кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па тэмах «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, трансляцыя» (№ ДР 20115713, зацверджана на Савеце ўніверсітэта 21.12.2010 г., пратакол № 4) і «Музеефікацыя гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: дасягненні і перспектывы» (№ ДР 20161947, зацверджана на Савеце ўніверсітэта 22.12.2015, пратакол № 4).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта* даследавання – вызначэнне перспектыўных культурна-адукацыйных практык актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны краязнаўчымі музеямі Беларусі.

Для дасягнення мэты даследавання пастаўлены наступныя *задачы*:

– акрэсліць этапы станаўлення і развіцця краязнаўчых музеяў Беларусі;

– выявіць інстытуцыянальныя і функцыянальныя асаблівасці краязнаўчага музея;

– прасачыць генезіс культурна-адукацыйнага ўзаемадзеяння краязнаўчага музея і яго аўдыторыі па актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны;

– вылучыць і ахарактарызаваць сучасныя формы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея.

**Навуковая навізна**

Навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў абумоўлена тым, што ў дысертацыі здзейснена комплекснае даследаванне сучасных культурна-адукацыйных практык айчынных краязнаўчых музеяў для ўключэння гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру, а канкрэтна: вызначаны этапы станаўлення і развіцця краязнаўчых музеяў Беларусі; раскрыты ўплыў палітычных, эканамічных, культурных і іншых фактараў на працэс іх узнікнення і фарміравання; акрэслены інстытуцыянальныя рысы і класіфікацыйныя характарыстыкі краязнаўчага музея; ахарактарызаваны сацыякультурныя функцыі краязнаўчага музея і прадстаўлены на двух узроўнях (інтрасістэмным і экстрасістэмным); вылучаны адукацыйныя канцэпцыі краязнаўчага музея і разгледжаны ў гістарычнай перспектыве; выяўлены і сістэматызаваны традыцыйныя і інавацыйныя формы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Правобразам сучасных краязнаўчых музеяў з’яўляюцца мясцовыя (радзімазнаўчыя) музеі, якія пачалі ўзнікаць у розных краінах Еўропы, у тым ліку і ў Расійскай імперыі, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. пад уплывам ідэй эпохі Асветніцтва і Рамантызму. Неабходнасць выяўлення, захавання і вывучэння культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

розных рэгіёнаў, іх гісторыка-культурнай спадчыны, павышэння адукацыйнага ўзроўню насельніцтва пэўнай тэрыторыі і іншыя фактары стымулявалі ўзнікненне і распаўсюджанне мясцовых музеяў, якія на тэрыторыі Беларусі сталі з'яўляцца ў сярэдзіне – другой палове XIX ст. У станаўленні і развіцці айчынных краязнаўчых музеяў можна вылучыць наступныя этапы: 1) 1850-я гг. – пачатак 1920-х гг.; 2) пачатак 1920-х гг. – 1944 г.; 3) 1944 г. – сярэдзіна 1950-х гг.; 4) сярэдзіна 1950-х – канец 1960-х гг.; 5) канец 1960-х – пачатак 1990-х гг.; 6) пачатак 1990-х – па сённяшні час. Прапанаваная перыядызацыя дазваляе прадэманстраваць уплыў палітычных, эканамічных і сацыякультурных працэсаў на фарміраванне краязнаўчых музеяў, паказаць іх колькасную дынаміку, вызначыць іх характэрныя рысы ў акрэсленыя перыяды.

2. Эвалюцыя краязнаўчых музеяў дазваляе выявіць іх асаблівасці: *шматпрофільнасць (комплекснасць), сацыякультурная і рэгіянальная накіраванасць дзейнасці*. На падставе пералічаных уласцівасцей прапанавана дэфініцыя краязнаўчага музея *як гістарычна абумоўленага, комплекснага інстытута сацыякультурнай памяці, сродкамі якога рэалізуецца грамадская патрэба ў захаванні, інтэрпрэтацыі і трансляцыі наступным пакаленням гісторыка-культурнай спадчыны мясцовай супольнасці*. Феномен краязнаўчага музея раскрываецца не толькі ў працэсе яго вызначэння, але і праз сацыякультурныя функцыі, якія ён выконвае ў адносінах да культуры, грамадства і асобы. Дынаміка дзейнасці краязнаўчых музеяў дазваляе разглядаць сацыякультурныя функцыі на двух узроўнях: *інтрасістэмным і экстрасістэмным*. Базавыя сацыякультурныя функцыі краязнаўчага музея, якія забяспечваюць яго функцыянаванне і адпавядаюць практычным кірункам музейнай дзейнасці (дакументаванне, адукацыя і выхаванне, арганізацыя вольнага часу), вылучаюцца на першым, *інтрасістэмным* узроўні. На другім, *экстрасістэмным,* узроўні сацыякультурныя функцыі краязнаўчага музея вызначаюцца яго грамадскім прызначэннем. У іх межах вылучаюцца функцыі сацыякультурнай памяці, сацыякультурнай рэфлексіі, сацыякультурнай камунікацыі, сацыякультурнай адаптацыі і сацыякультурнага праектавання. Пад уздзеяннем мясцовай спецыфікі сацыякультурныя функцыі краязнаўчых музеяў у найбольшай ступені звернуты да актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны, трансляцыі культуры, задавальнення патрэб мясцовай супольнасці.

3. Дынаміка развіцця краязнаўчага музея як сацыякультурнага інстытута адлюстроўвае працэс актуалізацыі і трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны праз арганізацыю яго зносін з аўдыторыяй. Такім чынам, узнікае неабходнасць удакладніць такую базавую сацыякультурную функцыю краязнаўчага музея, як адукацыя і выхаванне. Уяўленні грамадства аб прызначэнні краязнаўчага музея і змесце яго ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, а таксама тэрміналогія («культурна-асветная работа», «пазашкольная адукацыя», «палітыка-асветная», «прапагандысцкая», «навукова-асветная дзейнасць» і «культурна-адукацыйная»), ужытая для абазначэння падобнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці, сталі крытэрыем для характарыстыкі і перыядызацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея. На працягу кожнага перыяду рэалізоўвалася пэўная канцэпцыя зносін краязнаўчага музея з яго аўдыторыяй па актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны: *асветная* (1850-я гг. – канец 1920-х гг.), *прапагандысцкая* (канец 1920-х гг. – 1960-я гг.), *інфармацыйная* (1960-я гг. – канец 1980-х гг.) і *камунікацыйная* (канец 1980-х гг. – сённяшні час).

4. На сучасным этапе пад уздзеяннем сацыяльна-эканамічных і культурных фактараў краязнаўчы музей успрымаецца не толькі як месца захавання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, але як сродак яе актуалізацыі і трансляцыі наступным пакаленням. Найбольш эфектыўнымі і прыярэтэтнымі спосабамі актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны краязнаўчымі музеямі з'яўляюцца культурна-адукацыйныя практыкі, увасобленыя ў розных традыцыйных і інавацыйных формах узаемадзеяння з аўдыторыяй. *Традыцыйнымі* формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў з'яўляюцца *экскурсіі і лекцыі, кансультацыі, навуковыя чытанні (канферэнцыі, семінары і інш.), клубы (гурткі, студыі), конкурсы (алімпіяды, віктарыны), сустрэчы з цікавымі людзьмі, тэматычныя мерапрыемствы (канцэрты, вечарыны, тэатралізаваныя прадстаўленні, кватэрнікі) і інш.* Новыя сацыякультурныя рэаліі, змяненне ўяўленняў аб сутнасці адукацыйнай дзейнасці музея і іншыя прычыны не толькі відазмяняюць пералічаныя традыцыйныя формы, але стымулююць з'яўленне *інавацыйных (музейна-педагагічныя заняткі і праграмы, майстар-класы і творчыя майстэрні, музейныя гульні, музейныя праекты (у тым ліку – фестывалі і рэканструкцыі, міжмузейныя акцыі, музейныя святы і інш.).*

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца вынікам асабістых навуковых і практычных даследаванняў аўтара, заснавана на аналізе музеялагічных, культуралагічных і гістарычных прац з выкарыстаннем комплексу дакументальных крыніц, у якой аўтарам вызначаны і ахарактарызаваны этапы фарміравання краязнаўчых музеяў, даказана абумоўленасць з'яўлення краязнаўчых музеяў неабходнасцю вывучэння мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны, павышэннем узроўню самавызначэння мясцовага насельніцтва і іншымі сацыякультурнымі, палітычнымі і эканамічнымі фактарамі; раскрыты змест, эвалюцыя, відавая разнастайнасць краязнаўчых музеяў, прапанавана аўтарскае канцэптуальнае азначэнне краязнаўчага музея, сфармуляваны базавыя функцыі краязнаўчых музеяў і вылучаны іх узроўні; акрэслена трансфармацыя ўяўленняў грамадства аб прызначэнні краязнаўчага музея і змесце яго ўзаемадзеяння з аўдыторыяй; абагулены і сістэматызаваны практычны вопыт краязнаўчых музеяў у сферы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі культурна-адукацыйнай дзейнасці.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні даследавання адлюстраваны ў выступленнях на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, у тым ліку: міжнародных навуковых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канферэнцыях «Раманаўскія чытанні» (Магілёў, 2005, 2006), навукова-практычных канферэнцыях «Віцебскія старажытнасці» (Віцебск, 2012, 2013), навукова-практычнай канферэнцыі «Музей і патрыятычнае выхаванне» (Мінск, 2012), навукова-практычнай канферэнцыі «VI Тышкевіцкія чытанні: гісторыка-культурная спадчына Свіслацкага краю (да 760-годдзя горада Свіслач)» (Свіслач, 2016), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню» (Мінск, 2017), VII, IX Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Культура Беларуси: реалии современности» (Мінск, 2018, 2020), X, XI, XII, XIII Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 2016, 2017, 2018, 2019), I Рэспубліканскім краязнаўчым форуме (Мінск, 2020).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 23 публікацыях аўтара, 5 з якіх надрукаваны ў навуковых рэцэнзаваных часопісах, 6 – у навуковых зборніках, 8 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый і 4 – вучэбныя праграмы.

Агульны аб'ём публікацый складае 7,44 аўтарскіх аркуша, з якіх 1,4 аўтарскіх аркуша апублікавана ў выданнях, уключаных у пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі змяшчае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, асноўную частку, якая складаецца з трох глаў, заключэнне, бібліяграфічны спіс, 3 дадаткі і 5 актаў укаранення. Поўны аб'ём дысертацыі складае 184 старонкі, з іх 123 старонкі займае асноўны тэкст, 39 старонак – бібліяграфічны спіс (431 выкарыстаная крыніца і 23 найменні ў спісе публікацый аўтара); 22 старонкі займаюць дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтаваны выбар тэмы, яе актуальнасць і навуковая навізна, вызначаны мэта і задачы даследавання, адлюстравана сувязь работы з навуковымі праграмамі, сфармуляваны асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, прадстаўлены звесткі аб асабістым укладзе саіскальніка, апрабацыі і апублікаванасці вынікаў даследавання, структуры і аб'ёме дысертацыі.

У першай главе «**Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання»** аналізуюцца тэарэтычныя распрацоўкі айчынных і замежных навукоўцаў, што раскрываюць пытанні развіцця краязнаўчага музея як інстытута сацыякультурнай памяці, акрэсліваецца кола гістарычных крыніц, выкарыстаных пры распрацоўцы даследаванай тэмы, абгрунтоўваюцца падыходы і метады для вырашэння пастаўленых задач, разглядаецца працэс мадыфікацыі азначэння «краязнаўчы музей» і зместу яго дзейнасці, які адбываўся пад уплывам змен сацыякультурнага кантэксту.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

У раздзеле 1.1 **«Аналітычны агляд літаратуры і метадалогія даследавання»** сістэматызавана і прааналізавана літаратура па тэме дысертацыйнага даследавання, вызначаны крыніцазнаўчая і метадалагічная базы. Навуковая літаратура, выкарыстаная ў дысертацыйным даследаванні, умоўна аб’яднана ў тры блокі.

Першы складаюць работы, накіраваныя на асэнсаванне розных аспектаў сутнасці музея як інстытута сацыякультурнай памяці, яго грамадскага прызначэння і зместу культурна-адукацыйнай дзейнасці. Шырокі дыяпазон меркаванняў аб прыродзе і змесце музея, яго ўзаемасувязях з грамадствам прадстаўлены ў даследаваннях Й. Бенеша, З. А. Бонамі, В. С. Сапанжы, З. Странскага, М. Ф. Фёдарава, Л. М. Шляхцінай і інш. Праблематыка сутнасці музея цесна звязана з вызначэннем яго сацыякультурных функцый, разгледжаных у працах А. Б. Закс, А. Р. Мацевасян, Д. А. Равіковіч і інш. Шэраг даследчыкаў, сярод якіх Т. В. Галкіна, І. Г. Лупашка, В. У. Міронччык, К. Г. Плытнік, Б. А. Сталяроў, М. Ю. Юхневіч і інш., засяроджваюць увагу на пытаннях культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.

У другі блок уключаны публікацыі, якія аналізуюць феномен краязнаўчага музея, працэс яго станаўлення і развіцця, практыку актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі культурна-адукацыйнай дзейнасці. Паколькі правобразам краязнаўчых музеяў былі мясцовыя музеі, то ўзнікла неабходнасць звярнуцца да прац тэарэтыкаў і практыкаў музейнай справы XIX – пачатку XX ст. В. В. Дакучаева, Т. Зана, В. П. Кахоўскага і іншых, якія мелі вопыт іх стварэння і арганізацыі. Рэтраспектыўны характар маюць работы савецкіх і расійскіх даследчыкаў В. У. Іонавай, Д. А. Равіковіч, Т. А. Размуставай і інш. Працы згаданых гісторыкаў музейнай справы дазваляюць вызначыць асноўныя этапы і тэндэнцыі развіцця гэтай катэгорыі музеяў у розныя перыяды, а затым экстрапаліраваць атрыманыя высновы з пэўнымі абмежаваннямі на адпаведныя музеі Беларусі, тым больш што значны перыяд гісторыі яны развіваліся ў рэчышчы расійскай і савецкай музейнай палітыкі.

Перадумовы распаўсюджання мясцовых музеяў на тэрыторыі Беларусі разглядаліся ў кантэксце станаўлення краязнаўства ў дакастрычніцкі перыяд. У гэтым кірунку актыўна працавалі айчынныя навукоўцы Л. А. Аляксееў, Г. А. Каханоўскі, І. В. Грабянчук. Асобна неабходна вылучыць публікацыі А. А. Гужалоўскага, якія носяць абагульняючы характар і разглядаюць этапы фарміравання музеяў на тэрыторыі Беларусі ўвогуле і станаўленне краязнаўчых музеяў у прыватнасці. Гісторыя стварэння і дзейнасць асобных краязнаўчых музеяў аналізуюцца Т. А. Джумантаевай, Л. Ф. Кандрацьевай, В. М. Царук і інш. Асаблівасці ўзаемадзеяння краязнаўчых музеяў з аўдыторыяй раскрываюцца ў артыкулах А. Л. Ісачанкі, Н. М. Сіняк, С. С. Тыманюк і інш.

Пытанне сутнасці краязнаўчага музея, яго ролі ў грамадстве часткова закранаецца ў публікацыях расійскіх даследчыкаў А. В. Камісаравай, А. В. Кісялёва, А. В. Пятрова і інш. У беларускай гістарыяграфіі акрэсленая праблематыка засталася нераспрацаванай. Блізкасць паняццяў «рэгіянальны музей» і «краязнаўчы музей»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абумовіла неабходнасць разгляду публікацый М. А. Бяспалай, К. Ф. Катковай, С. Л. Шпарло і інш., якія аналізуюць спецыфіку дзейнасці рэгіянальных музеяў.

Даследаванні па пытаннях канцэптуалізацыі дэфініцыі «гісторыка-культурная спадчына» знаходзяцца на стыку нарматыўна-прававой сферы, культурнай палітыкі і навуковага асэнсавання і складаюць трэці блок. Значны ўклад у распрацоўку тэрміналагічных аспектаў нарматыўна-прававога забеспячэння помніка-ахоўнай дзейнасці ўнеслі як замежныя, так і айчынныя даследчыкі М. М. Багуслаўскі, С. М. Малчанаў, І. Э. Мартыненка і інш. Тэарэтычнае асэнсаванне гісторыка-культурнай спадчыны як культурнага феномена, яе функцый знайшлі адлюстраванне ў працах Э. А. Балера, Ю. А. Вядзеніна, А. М. Дзьячкова, Н. Я. Шалупенкі і інш. Пытанні актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны музейнымі сродкамі сталі аб’ектам даследавання П. В. Глушковай, Д. В. Герасімёнка, Я. А. Кавалёва, Т. С. Кур’янавай і інш.

Такім чынам, адзначым, што нягледзячы на актуальнасць праблемы і актыўнасць вывучэння некаторых яе аспектаў, культурна-адукацыйная дзейнасць краязнаўчых музеяў па ўключэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру застаецца недастаткова распрацаванай.

*Крыніцазнаўчая база* даследавання заснавана на выкарыстанні цэлага комплексу пісьмовых крыніц. Першую групу складаюць заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць пытанні функцыянавання музеяў. Другую групу ўтвараюць матэрыялы справаводства, што адлюстроўваюць розныя кірункі практычнай дзейнасці краязнаўчых музеяў. У трэцюю групу аб’яднаны статыстычныя матэрыялы, якія сведчаць аб дынаміцы музейнага развіцця, практычнай дзейнасці музеяў (зборнікі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і інш.). Асобна можна вылучыць матэрыялы краязнаўчых і музейных канферэнцый і з’ездаў, на якіх разглядаліся адпаведныя пытанні, перыядычны друк і электронныя рэсурсы аддаленага доступу, што характарызуюцца аператыўнасцю падачы інфармацыі і яе шматпланавасцю.

*Метадалогія даследавання* заснавана на культуралагічным падыходзе, што дазволіў разглядаць музей як арганічную частку цэласнага культурнага ўніверсуму, як феномен, які ўзнік, функцыянуе і развіваецца ва ўмовах метасістэмы культуры.

У працэсе даследавання аўтар кіраваўся прынцыпамі гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці, што дазволіла атрымаць навукова абгрунтаваныя і аб’ектыўныя высновы. Міждысцыплінарны характар даследавання абумовіў неабходнасць звароту як да агульнанавуковых метадаў (аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, класіфікацыя і сістэматызацыя, статыстычны метад), так і спецыяльных гістарычных (гісторыка-параўнальны, гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны) і культуралагічных (структурна-функцыянальны, культурна-гістарычны, семіятычны і аксіялагічны).

У раздзеле 1.2 **«Краязнаўчы музей: мадыфікацыя азначэння і зместу дзейнасці»** адзначаецца, што ў выніку распаўсюджання ідэй эпохі Асветніцтва і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рамантызму, змянення сацыяльна-культурных, эканамічных і палітычных абставін у канцы XVIII – першай палове XIX ст. у розных краінах Еўропы пачалі з'яўляцца мясцовыя музеі, разгледжаныя намі як правобразы краязнаўчых музеяў. Найбольш актыўна яны развіваліся ў Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі, Аўстрыі і інш. Нягледзячы на пэўныя адрозненні, дэтэрмінаваныя асаблівасцямі развіцця культуры, эканомікі і інш., мясцовыя музеі дакументавалі і папулярызавалі культуру і гісторыю асобных тэрытарыяльных адзінак, вывучалі мясцовыя старажытнасці. Найбольш актыўна мясцовыя музеі пачалі стварацца ў другой палове XIX – пачатку XX ст. пад уплывам агульнаеўрапейскага інтэлектуальнага руху – рэгіяналізму.

Аналагічныя працэсы назіраліся і на тэрыторыі Расійскай імперыі, дзе першыя падобныя музеі з'явіліся ў пачатку XIX ст., аднак іх масавае распаўсюджанне адбывалася ў другой палове XIX – пачатку XX ст. У акрэслены перыяд мясцовыя музеі пачалі ўзнікаць і на тэрыторыі Беларусі. Сярод фактараў, якія стымулявалі стварэнне і развіццё мясцовых музеяў, можна назваць мадэрнізацыю эканомікі, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, павышэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню насельніцтва, асэнсаванне патрэбы ў выяўленні, даследаванні і захаванні своеасаблівасці культуры розных рэгіёнаў.

Да пачатку XX ст. сфарміравалася ўнутраная структура мясцовых музеяў, якая адлюстроўвала склад іх збораў. Нягледзячы на асобныя цяжкасці (адсутнасць рэгулярнага фінансавання, дакладнай праграмы дзеяння і інш.), мясцовымі музеямі былі сабраны даволі значныя па аб'ёме і навуковай вартасці калекцыі разнастайных прадметаў, выдаваліся навуковыя каталогі, праводзілася асветніцкая работа сярод шырокіх колаў насельніцтва.

Маштабныя перамены ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці краіны пасля ўсталявання ў кастрычніку 1917 г. савецкай улады істотна паўплывалі на развіццё мясцовых музеяў. Яны ператварыліся ў прапагандысцкія ўстановы, цэнтры асветніцкай работы ў строга акрэсленых уладамі ідэалагічных межах. У першыя дзесяцігоддзі XX ст. у Расійскай імперыі, а затым у СССР развіццё мясцовых музеяў было цесна звязана з рэгіяналізмам, які прыняў тут формы спачатку радзімазнаўства, а затым і краязнаўства. Распаўсюджанне тэрміна «*краязнаўчы музей*» у паслярэвалюцыйны перыяд было абумоўлена ўвядзеннем у 1924 г. у СССР новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі «край», што выклікала змены ў назве мясцовых устаноў. Упершыню тэрмін «краязнаўчы музей» прагучаў на II Усесаюзнай канферэнцыі па краязнаўстве (Масква, 1924), якая пацвердзіла комплексны характар такога музея і вызначыла яго як цэнтр вывучэння мясцовага краю.

У наступныя дзесяцігоддзі краязнаўчыя музеі працягвалі вызначацца як навуковыя цэнтры краязнаўства, як сховішчы помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, дзе канцэнтравалася інфармацыя аб прыродзе, гістарычным мінулым і сацыялістычнай перабудове краю. Аднак нацыянальны і рэгіянальны складнікі гісторыі і культуры краю адлюстроўваліся выключна этнаграфічнымі калекцыямі. Тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не менш дзейнасць краязнаўчых музеяў была накіравана на далучэнне мясцовай грамадскасці да вывучэння гісторыі, на захаванне і актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны. Ва ўмовах недахопу ўстаноў культуры на месцах краязнаўчыя музеі актыўна ўплывалі на сацыякультурную сітуацыю ў пэўнай мясцовасці, стваралі культурны асяродак, выконвалі функцыі культурна-асветніцкіх цэнтраў.

У канцы XX – пачатку XXI ст. у кантэксце змен у сацыякультурнай сітуацыі пашырылася магчымасць музейнымі сродкамі вырашаць культурныя і грамадскія праблемы. Краязнаўчы музей пачынае разглядацца як інстытут, дзейнасць якога можа садзейнічаць развіццю творчага патэнцыялу асобы, фарміраванню каштоўнасных маральных арыенціраў.

У другой главе дысертацыі **«Краязнаўчы музей як інстытут сацыякультурнай памяці»** на падставе сістэматызацыі эмпірычнага матэрыялу здзейснены аналіз перадумоў стварэння краязнаўчых музеяў, акрэслены этапы іх фарміравання на тэрыторыі Беларусі, вызначаны інстытуцыянальныя характарыстыкі краязнаўчага музея і выяўлены яго сацыякультурныя функцыі.

У раздзеле 2.1 **«Станаўленне і развіццё краязнаўчых музеяў Беларусі ў дынаміцы сацыякультурных працэсаў»** праведзены аналіз палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных абставін, якія дэтэрмінавалі працэс узнікнення краязнаўчых музеяў на тэрыторыі Беларусі, і вызначаны асноўныя этапы станаўлення і развіцця згаданых музеяў. Пры вылучэнні этапаў мы зыходзілі як з асаблівасцей фарміравання саміх краязнаўчых музеяў і музейнай справы, так і з улікам змен у сацыякультурным жыцці грамадства.

На першым этапе (1850-я гг. – пачатак 1920-х гг.) склаліся перадумовы для з’яўлення правобразаў краязнаўчых музеяў. Імі з’явіліся мясцовыя музеі, створаныя навуковымі таварыствамі, губернскімі статыстычнымі камітэтамі, органамі гарадскога самакіравання пры актыўным удзеле мясцовай грамадскасці. Яны спрабавалі ўцягнуць мясцовую інтэлігенцыю ў вывучэнне свайго краю, выявіць і захаваць спецыфіку культуры розных рэгіёнаў Беларусі. У акрэсленыя гады на тэрыторыі Беларусі было заснавана 8 мясцовых музеяў.

Другі этап (пачатак 1920-х гг. – 1944 г.) звязаны з разгортваннем краязнаўчага руху і актыўнымі мерапрыемствамі па стварэнні грамадскіх краязнаўчых музеяў як на тэрыторыі БССР, так і ў Заходняй Беларусі. У БССР адкрыццё грамадскіх краязнаўчых музеяў было ініцыявана дзяржаўнай уладай, якая ўскладала на іх задачы сацыяльна-ідэалагічнага характару. Аднак у 1920-я гг. яны ўзнікалі як вынік дзейнасці мясцовых краязнаўчых арганізацый. У музеях сфарміраваліся зборы, што дакументавалі этнаграфічныя і прыродныя асаблівасці рэгіёна, яго гістарычнае, палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё. Музеі пачалі выконваць ролю культурных і навуковых цэнтраў рэгіёна, сталі асяродкам вывучэння мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны. У 1930-я гг. змены ў культурнай палітыцы і згортванне беларусізацыі выклікалі пераарыентацыю краязнаўства і краязнаўчых музеяў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкананне ўтылітарных народна-гаспадарчых задач. Такія адносіны прывялі да знішчэння большасці краязнаўчых музеяў БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны значная частка краязнаўчых музеяў страціла свае зборы.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі краязнаўчыя музеі развіваліся ў кантэксце праграмы рэгіяналізму, прынятай у польскай дзяржаве ў 1926 г. Большасць створаных краязнаўчых музеяў Заходняй Беларусі (у Пінску, Баранавічах, Ваўкавыску, Слоніме і інш.) падпарадкоўвалася Польскаму краязнаўчаму таварыству. Іх дзейнасць накіравана на захаванне і актуалізацыю праяў мясцовых варыяцый польскай культуры, на азнаямленне заходнебеларускай грамадскасці з польскай культурай і папулярызацыю ведаў пра яе. Аднак ва ўмовах знаходжання ў межах іншай дзяржавы прадстаўленыя ў экспазіцыях заходнебеларускіх краязнаўчых музеяў прадметы не атрымалі нацыянальнай інтэрпрэтацыі. Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР распрацаваны план рэарганізацыі музейнай сеткі ў адпаведнасці з новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам. Аднак з-за пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён не быў рэалізаваны. Усяго на другім этапе было створана 43 краязнаўчых музея.

Трэці этап (1944 г. – сярэдзіна 1950-х гг.) характарызаваўся напружанай працай па аднаўленні сеткі краязнаўчых музеяў пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адкрыццё і функцыянаванне значнай колькасці краязнаўчых музеяў (было адноўлена 13 краязнаўчых музеяў) патрабавала арганізацыйнага і юрыдычнага забеспячэння іх дзейнасці. Падрыхтаваны тыпавыя палажэнні краязнаўчых музеяў розных узроўняў (у 1945, 1946 і 1954 гг.). Яны характарызавалі музей як навукова-асветную ўстанову, што стваралася для захавання і вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры пэўнай мясцовасці.

Чацвёртаму этапу (сярэдзіна 1950-х – канец 1960-х гг.) былі ўласцівы супрацьлеглыя тэндэнцыі. З аднаго боку, з-за скарачэння фінансавання сферы культуры частка дзяржаўных краязнаўчых музеяў была пераўтворана ў народныя, што адмоўным чынам адбілася на іх дзейнасці. З іншага боку, назіралася стабілізацыя дзейнасці краязнаўчых музеяў, упарадкаванне і ўскладненне іх сеткі. На працягу чацвёртага этапу на тэрыторыі Беларусі працаваў 31 краязнаўчы музей.

Пяты этап (канец 1960-х – пачатак 1990-х гг.) вызначаецца актыўным стварэннем краязнаўчых музеяў (да канца этапу ў рэспубліцы дзейнічала 54 музея), у тым ліку за кошт адкрыцця музеяў народнай і баявой славы, упарадкаваннем іх работы. Разам з тым назіраецца ідэалагізацыя ўсіх кірункаў дзейнасці і абмежаванне тэматыкі навуковых даследаванняў савецкай праблематыкай. Некаторае змяненне сітуацыі пачынаецца ў канцы 1980-х гг. пад уплывам працэсаў перабудовы і дэмакратызацыі.

У пачатку 1990-х гг. пачаўся шосты этап у гісторыі краязнаўчых музеяў. Нягледзячы на сур'ёзныя фінансавыя цяжкасці, працэс стварэння і адкрыцця новых краязнаўчых музеяў працягваўся. Ва ўмовах працэсу глабалізацыі і процілеглага працэсу глакалізацыі краязнаўчыя музеі становяцца надзвычай запатрабаванымі. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

азначаны перыяд фарміруюцца новыя прававыя асновы развіцця музейнай справы, актывізуюцца яе кірункі, узмацняецца матэрыяльна-тэхнічная база музеяў, з'яўляюцца інавацыйныя практыкі актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны ў адукацыйнай прасторы музея. Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі сфарміравалася разгалінаваная сетка краязнаўчых музеяў (85 музеяў, што складае 53,4 % ад агульнай колькасці музеяў у сістэме Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь).

У раздзеле 2.2 **«Інстытуцыянальныя рысы і сацыякультурныя функцыі краязнаўчага музея»** вызначаюцца яго ўласцівасці, класіфікацыйныя формы і грамадскае прызначэнне. Нягледзячы на наяўнасць азначэння музея, прынятага Міжнародным саветам музеяў, сусветная музеялагічная думка дэманструе шырокі дыяпазон меркаванняў аб прыродзе і сутнасці музея: ад вузкага разумення музея як установы з наборам канкрэтных функцый да больш шырокага ўспрыняцця яго як аб'екта сацыякультурнага развіцця. Аўтарам прааналізаваны разнастайныя падыходы да вызначэння музея: як навукова-даследчай установы; як вынік спецыфічных адносін чалавека да рэчаіснасці; як камунікацыйнай сістэмы; як культурнай формы; як механізму культурнага наследавання і інш. Прыведзеныя характарыстыкі ў пэўнай ступені раскрываюць разуменне сутнасці музея на розных этапах развіцця.

Рэтраспектыўны аналіз краязнаўчага музея дазваляе акрэсліць яго асаблівасці: *шматпрофільнасць (комплекснасць), сацыякультурная і рэгіянальная скіраванасць яго дзейнасці*. Акрэсленыя характарыстыкі далі магчымасць сфармуляваць аўтарскае канцэптуальнае азначэнне краязнаўчага музея, прадстаўленае ў палажэнні 2.

Як і музеі іншых профіляў, краязнаўчыя валодаюць характарыстыкамі, якія дазваляюць ажыццявіць іх класіфікацыю па пэўных крытэрыях. Па меркаванні асобных даследчыкаў найбольш універсальным крытэрыем для правядзення падзелу музеяў на пэўныя групы з'яўляецца *профіль* музея. Вышэй адзначалася, што краязнаўчыя музеі – музеі комплекснага профілю, паколькі яго фондавыя зборы аб'ядноўваюць крыніцы розных навук: гістарычных (археалогія, этнаграфія, уласна гісторыя і г. д.), прыродазнаўчых, літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства і інш. Таму мы не лічым мэтазгодным вылучаць у складзе краязнаўчых музеяў больш вузкія профільны групы. Згодна з *класіфікацыяй па роду дзейнасці (ці грамадскім прызначэнні) музея,* усе прааналізаваныя ў дысертацыі краязнаўчыя музеі адносяцца да навукова-асветніцкіх. Па *спосабе рэалізацыі функцыі дакументавання* разгледжаныя краязнаўчыя музеі падзяляюцца на музеі ансамблевыя (Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Жыліцкі гістарычны комплекс-музей і Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей) і калекцыйныя (усе астатнія). *Па форме ўласнасці* ўсе краязнаўчыя музеі з'яўляюцца дзяржаўнымі. Па *адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прымеце* ў складзе краязнаўчых музеяў вылучаюць музеі абласнога (9 музеяў), раённага (67 музеяў), гарадскога (8 музеяў) падпарадкавання і 1 музей (Чавускі раённы гісторыка-краязнаўчы музей) мае двайное падпарадкаванне. *Па прававым статусе* сярод даследаваных краязнаўчых музеяў можна вылучыць галаўныя (іх большасць) і філіялы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Полацкі краязнаўчы музей, Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага). У апошнія дзесяцігоддзі структура сеткі краязнаўчых музеяў стала больш складанай, што патрабуе ўносіць пэўныя змены ў класіфікацыйныя схемы. Намі прапанаваны яшчэ адзін крытэрый – *складанасць структуры музея,* на падставе якога вылучаюцца монаструктурныя (не маюць філіялаў) і поліструктурныя музеі (у складзе якіх дзейнічае адзін і больш філіялаў). Так, монаструктурных рэгіянальных краязнаўчых музеяў налічваецца 49, а поліструктурных – 36. Маючы на ўвазе прапанаваную класіфікацыю, адзначым, што яна не з'яўляецца канчатковай і ўніверсальнай.

Захаванне і прадстаўленне аўтэнтычных прадметаў абумоўлівае канцэптуальнае адрозненне музея і спецыфікі яго функцыянавання ў сістэме іншых сацыяльных інстытуцый. Такое разуменне музея дае нам магчымасць разглядаць сацыякультурныя функцыі на двух узроўнях. На першым, *інтрасістэмным*, сацыякультурныя функцыі забяспечваюць жыццядзейнасць самога музея як цэлага і адпавядаюць практычным напрамкам музейнай работы: дакументаванне, адукацыя і выхаванне, арганізацыя вольнага часу. Роля і месца музея ў сацыякультурным асяроддзі, сэнс яго існавання для сённяшніх пакаленняў на дадзеным гістарычным этапе і адпаведныя метафункцыі – сацыякультурнай памяці, сацыякультурнай рэфлексіі, сацыякультурнай камунікацыі, сацыякультурнай адаптацыі і сацыякультурнага праектавання – складаюць другі, *экстрасістэмны* ўзровень.

Узаемазалежнасць і ўзаемаабумоўленасць сацыякультурных функцый праяўляецца ва ўсіх відах музейнай дзейнасці. Іх важнымі ўласцівасцямі з'яўляюцца, з аднаго боку, дынамізм, а з іншага – стабільнасць. Паколькі грамадскія патрабаванні да музея змяняюцца пад уздзеяннем знешніх фактараў, то ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі дамінуе тая ці іншая функцыя. У той жа час дакументуючае і адукацыйна-выхаваўчае значэнні музея застаюцца нязменнымі, што сведчыць аб іх стабільнасці і дае магчымасць лічыць іх базавымі функцыямі любога музея, у тым ліку і краязнаўчага.

У трэцяй главе дысертацыі **«Гісторыка-культурная спадчына ў прасторы краязнаўчых музеяў Беларусі: формы актуалізацыі»** адзначаецца, што культурна-адукацыйная дзейнасць з'яўляецца аптымальным кірункам актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны, прасочваецца генезіс адукацыйных канцэпцый краязнаўчых музеяў, аналізуюцца сучасныя культурна-адукацыйныя практыкі па ўключэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру.

У раздзеле 3.1 **«Трансфармацыя адукацыйных канцэпцый краязнаўчых музеяў»** адзначаецца, што станаўленне музея было непарыўна звязана з рэальнай патрэбай развіваць спецыялізаваныя формы інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Такім чынам, узнікла перадумова для фарміравання функцыі адукацыі і выхавання. Уплыў сацыякультурнай сітуацыі на эвалюцыю музейнай справы садзейнічаў фарміраванню разнастайных канцэпцый узаемадзеяння краязнаўчага музея і яго аўдыторыі, крытэрыем для вылучэння якіх з'яўляюцца ўяўленні грамадства аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызначэнні музея і змесце яго дзейнасці, а таксама тэрміналогія, якая выкарыстоўвалася для абазначэння падобнай дзейнасці. Змяненне канцэпцый з’яўляецца асновай для перыядызацыі развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці, што не супадае з акрэсленымі этапамі развіцця краязнаўчых музеяў.

*Асветная канцэпцыя* (1850-я – канец 1920-х гг.) заснавана на стаўленні да музея як дэмакратычнага па сваёй прыродзе інстытута. Музеі актыўна пачалі супрацоўнічаць са школай і ўключацца ў сістэму пазашкольнай адукацыі. Такія адносіны выклікалі да жыцця і спецыяльныя тэрміны «культурна-асветная работа», «пазашкольная адукацыя». У гэты перыяд пачынае зараджацца практыка ўзаемадзеяння з наведвальнікамі ў форме экскурсій і, у асобных выпадках, публічных чытанняў і заняткаў на базе экспазіцыі. Крыніцы сведчаць аб наладжанай рабоце з аўдыторыяй у Віленскім музеі старажытнасцей, Гродзенскім агульнаадукацыйным музеі і інш. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі многія культурныя пачынанні дарэвалюцыйнага перыяду пашырыліся. Важнасць музеяў у справе асветы, абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа былі бясспрэчнымі для дэмакратычнай інтэлігенцыі. На хвалі беларускага адраджэння і затым беларусізацыі пачалося вывучэнне Беларусі, яе нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны, праца па захаванні і актуалізацыі якой увасобілася ў масавым стварэнні краязнаўчых музеяў, разгортванні экскурсійнай справы.

Аднак у другой палове 1920-х гг. пад уплывам новай сацыякультурнай сітуацыі змяняюцца адносіны да музея, які пачаў успрымацца як сродак нагляднай ілюстрацыі палітычнай дактрыны. Такія адносіны да музея дазваляюць гаварыць аб фарміраванні новай адукацыйнай канцэпцыі – *прапагандысцкай*, якая ахоплівала перыяд з канца 1920-х да 1960-х гг. і знайшла адлюстраванне ў новай тэрміналогіі: «палітыка-асветная», «прапагандысцкая», «масавая работа». Асноўнымі формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці і практыкі актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны беларускіх музеяў, у тым ліку і краязнаўчых, засталіся лекцыі і экскурсіі, да якіх дадаліся сустрэчы з цікавымі людзьмі, «музейныя дні», мічурынскія вечарыны і некаторыя іншыя. Сярод станоўчых момантаў акрэсленага перыяду адзначым таксама ўключэнне краязнаўчых музеяў у кола аб’ектаў турыстычнага агляду.

Хібы названага перыяду пачалі пераадольвацца на наступным этапе (1960-я – канец 1980-х гг.), для якога было характэрна імкненне вярнуць музею статус навуковай, а не толькі прапагандысцкай установы. Пошукі музеем свайго месца ў сістэме інстытутаў культуры і адукацыі звязаны з зацвярджэннем *інфармацыйнай канцэпцыі*, з’яўленне якой было выклікана музейным бумам 1960 – 1980-х гг. Гэтыя змены ўвасобіліся ў новым тэрміне «навукова-асветная дзейнасць». Распаўсюджанне ведаў, якія маюць прадметную аснову і навуковы характар, у краязнаўчых музеях адбывалася праз новыя формы работы з музейнай аўдыторыяй: літаратурныя вечарыны, канцэрты, музейныя гурткі і інш. Разам з тым музеі працягвалі заставацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэалагічнымі ўстановамі, дзейнасць якіх накіроўвалася дырэктыўнымі ўказаннямі партыйных органаў.

У канцы 1980-х гг. адбываўся паступовы адыход ад інфармацыйнай канцэпцыі музея на карысць *камунікацыйнай*, якая доўжыцца па сённяшні час. Укараненне ў айчынную музейную практыку асноўных палажэнняў тэорыі музейнай камунікацыі не было непасрэдна звязана з перабудовай, аднак змены, якія адбываліся ў краіне, падштурхоўвалі музей пазбавіцца ідэалагічных установак. Для абазначэння ўзаемаадносін музея і яго аўдыторыі стаў выкарыстоўвацца новы тэрмін – «культурна-адукацыйная дзейнасць». У межах новай канцэпцыі прыярытэтнымі становяцца зварот да ўнутранага свету наведвальніка, уздзеянне на яго пачуццёва-эмацыянальную сферу, фарміраванне каштоўнасных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны. Станаўленне новай канцэпцыі садзейнічала з'яўленню і распаўсюджанню інавацыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, пашырэнню аўдыторыі музея за кошт дашкольнікаў і малодшых школьнікаў, людзей трэцяга ўзросту і з фізічнымі, псіхічнымі і сэнсарнымі абмежаваннямі.

У раздзеле 3.2 **«Традыцыйныя формы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны краязнаўчымі музеямі»** вылучаюцца і характарызуюцца формы, якія з'явіліся ў пачатковы перыяд развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці і таму могуць лічыцца традыцыйнымі. Тэматычнай асновай пералічаных форм з'яўляецца мясцовая гісторыка-культурная спадчына, увасобленая ў аўтэнтычных музейных прадметах.

Прадуктыўнай і запатрабаванай формай уключэння ў сучасную культуру аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца *экскурсія*. Аналіз практычнай дзейнасці краязнаўчых музеяў паказаў, што распрацаваныя імі экскурсіі адрозніваюцца: *па змесце ці характары тэматыкі, па месцы правядзення і аб'ектах паказу, па мэтавай скіраванасці, па складзе экскурсантаў.* Асаблівасць гістарычнага і культурнага развіцця рэгіёна, навукова-даследчая актыўнасць супрацоўнікаў абумоўліваюць распрацоўку экскурсій, уласцівых канкрэтнаму музею.

Характэрнай рысай апошніх гадоў можна лічыць узмацненне цікавасці да *музейных лекцый*, спецыфіка якіх заключана ў абавязковай наяўнасці музейнага прадмета і ярка акрэсленым адукацыйным характары. Вывучэнне практычнай дзейнасці краязнаўчых музеяў паказала, што наведвальнікам прапануецца шырокі пералік лекцый на мясцовую тэматыку, колькасць якіх вар'іруецца ад некалькіх адзінак да двух – двух з паловай дзясяткаў. У сітуацыі распаўсюджання пандэміі COVID-19 музеі былі вымушаны пашыраць прэзентацыю сваёй дзейнасці ў мэдыяпрасторы за кошт анлайн-форм (лекцый, экскурсій і г. д.).

Спецыфічнай формай актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляюцца *навуковыя чытанні і канферэнцыі,* што не толькі задавальняюць пазнавальныя інтарэсы грамадскасці, але і павышаюць прэстыж краязнаўчага музея як навукова-даследчай установы. У перыяд з 1991 г. па 2018 г. краязнаўчымі музеямі рэспублікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было праведзена каля 180 навуковых канферэнцый. Сярод іх можна вылучыць *уласнакраязнаўчыя канферэнцыі* і *канферэнцыі на тэмы профільнай праблематыкі*.

Перавага навучэнцаў сярод наведвальнікаў стымулюе выкарыстанне ў краязнаўчых музеях такой формы ўключэння спадчыны ў сучасную культуру, як *віктарыны, конкурсы і алімпіяды*, прычым яны прынцыпова адрозніваюцца ад школьных прадметных спаборніцтваў не толькі тэматыкай і месцам правядзення, але формай і зместам конкурсных заданняў. Музейныя алімпіяды прадугледжваюць веданне і навуковых фактаў, і экспазіцыі музея, і асобных музейных прадметаў. Яны дазваляюць дзецям больш шырока і глыбока пазнаёміцца з мясцовымі помнікамі гісторыі і культуры, садзейнічаюць далучэнню вучняў да прадметнага асяроддзя мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны.

Значным патэнцыялам для гэтага валодаюць такія формы, як *музейныя канцэрты, імпрэзы, тэатралізаваныя прадстаўленні, кватэрнікі* і г. д. Выкарыстанне названых форм сведчыць аб больш шырокім тлумачэнні гісторыка-культурнай спадчыны, аб уключэнні ў яе непрадметных форм яе бытавання. Калі ў большасці традыцыйных форм дзейнасці музея асноўнымі метадамі названага працэсу з'яўляюцца фіксацыя і інтэрпрэтацыя, то тут дадаюцца метады тэатралізацыі, рэканструкцыі і інш.

На мяжы XX – XXI ст. пад уплывам сацыякультурных фактараў адбываецца мадэрнізацыя традыцыйных форм за кошт пашырэння іх варыятыўнасці (*экскурсіі-квесты, тэатралізаваныя экскурсіі* і г. д., *лекцыі-прэзентацыі, анлайн-экскурсіі, лекцыі і кансультацыі*), выкарыстання новых методык (*метад тэатралізацыі, анімацыі* і г. д.), далучэння да музейнай дзейнасці больш шырокіх колаў аўдыторыі і інш.

У раздзеле 3.3 «**Інавацыйны вопыт уключэння гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру**» адзначаецца, што сучаснае ўсведамленне адукацыйнай ролі музея праявілася ў развіцці інавацыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці, характэрнай рысай якіх становіцца актыўнае ўключэнне наведвальнікаў у музейна-камунікацыйны працэс праз такія *перспектыўныя* формы, як *музейна-педагагічныя заняткі і праграмы, разнастайныя музейныя праекты, майстар-класы і творчыя майстэрні, музейныя гульні*. Інавацыйнымі можна лічыць формы, што існуюць адносна нядаўна (не больш за 20–30 гадоў) і запазычаны з іншых сфер культуры, навукі і адукацыі ці абумоўлены развіццём новых тэхналогій музейнай дзейнасці.

Эфектыўнасць *музейна-педагагічнага занятку* заключаецца ў інтэграцыі педагагічных прынцыпаў інтэрактыўнасці, комплекснасці і інш. Музейна-педагагічны занятак скіраваны на перадачу, практычнае засваенне і актуалізацыю пэўнага гістарычнага вопыту, ведаў, майстэрства. Сярод музейна-педагагічных заняткаў краязнаўчых музеяў рэспублікі найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца заняткі этнаграфічнай тэматыкі, што тлумачыцца значнымі этнаграфічнымі калекцыямі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў, імклівай урбанізацыяй населеных пунктаў, адыходам у нябыт узораў традыцыйнай культуры, імкненнем іх захаваць, наяўнасцю носьбітаў традыцыі.

Вопыт актуалізацыі засяроджанай у музейных прадметах гісторыка-культурнай спадчыны сведчыць аб мэтазгоднасці аб’яднання падобных заняткаў у *музейна-педагагічную праграму*, што можна вызначыць як комплексную форму культурна-адукацыйнай дзейнасці, заснаваную на актыўным удзеле наведвальнікаў у працэсе музейнай камунікацыі. Тэндэнцыя апошніх гадоў – стварэнне спецыяльных праграм не толькі для дзяцей, але і для падлеткаў, студэнтаў, наведвальнікаў з абмежаванымі магчымасцямі, сямейных наведвальнікаў.

Эфектыўнай і інавацыйнай практыкай актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны з’яўляюцца *музейныя праекты*, якія можна класіфікаваць па ўзроставым складзе аўдыторыі (дзіцячыя, моладзевыя, для людзей сярэдняга ўзросту, для пажылых людзей, змешаныя) і па мэтавым прызначэнні (адукацыйныя і рэкрэацыйныя). Сярод адукацыйных вылучаюцца праекты па выяўленчым мастацтве, краязнаўчыя, экалагічныя, прысвечаныя адраджэнню народных традыцый і інш. Сярод найбольш цікавых і значных адукацыйных музейных праектаў можна назваць праекты Капыльскага раённага краязнаўчага музея («*Уклад у сусветную культуру ўраджэнцаў Капыльшчыны, якія эмігравалі ў пачатку ХХ ст.*» і інш.), Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея («*Крытычны разгляд гісторыі праз дыялог пакаленняў. Раскажы мне сваё жыццё*» і інш.). Дастаткова папулярныя рэкрэацыйныя праекты, што ажыццяўляюцца ў выглядзе самастойных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці (*музейнае свята, гістарычныя рэканструкцыі і фестывалі*).

Характэрнай рысай апошніх дзесяцігоддзяў з’яўляецца выкарыстанне музеямі не ўласцівых ім форм камунікацыі, напрыклад *музейнага свята*. Сярод музейных святаў можна вылучыць *міжнародныя* (Міжнародны дзень сям’і, Міжнародны дзень аховы дзяцей і г. д.) і *нацыянальныя* (дзяржаўныя, народныя, сямейныя, дзіцячыя, школьныя і студэнцкія, літаратурныя, ваенна-гістарычныя і г. д.). Як варыянт музейнага свята можна разглядаць арганізацыю ў музеі вяселля, святкаванне дня нараджэння, Дня закаханых і г. д. Унікальным варыянтам музейнага свята з’яўляецца *Ноч музеяў*.

Да інавацыйных культурна-адукацыйных практык актуалізацыі спадчыны можна аднесці *гістарычныя рэканструкцыі* і *фестывалі.* Шырокую вядомасць атрымалі фестываль сярэднявечнай культуры «*Меч Брачыслава*» Браслаўскага раённага аб’яднання музеяў, ваенна-гістарычны фестываль-рэканструкцыя Івацэвіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея «*Выганашчанская фартэцыя*», прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны, і інш.

*Майстар-клас* скіраваны на вырашэнне цэлага спектра задач, звязаных з атрыманнем і абменам прафесійным вопытам, актуалізацыяй традыцыйнай культуры. Такая форма культурна-адукацыйнай дзейнасці, як *музейная гульня,* непасрэдна звязана з пашырэннем камунікацыйнай канцэпцыі ўзаемадзеяння музея і яго аўдыторыі. Музейную гульню можна разглядаць як сродак актывізацыі аўдыторыі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогай гульнявых методык і прыёмаў для павышэння эфектыўнасці ўспрыняцця гісторыка-культурнай спадчыны. Яе асаблівасць у тым, што яна цалкам будуецца на ролевых паводзінах удзельнікаў і дае магчымасць паглыбіцца ў мінулае, набыць вопыт непасрэднага дакранання да гісторыі.

Комплексны характар акрэсленых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў абумоўлівае выкарыстанне такіх метадаў актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны, як фіксацыя, рэканструкцыя, мадэляванне і інтэрпрэтацыя.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Пад уздзеяннем ідэй эпохі Асветніцтва і Рамантызму ў шэрагу еўрапейскіх краін у канцы XVIII – пачатку XIX ст. пачалі распаўсюджвацца мясцовыя (ці радзімазнаўчыя) музеі. Яны займаліся зборам, вывучэннем і прадстаўленнем мясцовых прадметаў гістарычнага, натуральнага і мастацкага характару і ўтрымлівалі ў сваёй назве найменне пэўнай тэрыторыі ці населенага пункта. Такія музеі можна лічыць прататыпам краязнаўчых музеяў. У сярэдзіне – другой палове XIX ст. падобныя музеі сталі ўзнікаць і на тэрыторыі Беларусі. Іх з'яўленне і далейшае развіццё залежала ад шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў: мадэрнізацыі розных галін эканомікі, патрэбы ў стацыянарным вывучэнні розных рэгіёнаў, асэнсавання неабходнасці выяўлення, даследавання і захавання своеасаблівасці іх культуры і гісторыка-культурнай спадчыны, ад развіцця краязнаўчага руху, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, асаблівасці менталітэту насельніцтва ў канкрэтных рэгіёнах, павышэння яго агульнаадукацыйнага ўзроўню і інш. У станаўленні і развіцці краязнаўчых музеяў Беларусі выразна акрэсліваюцца наступныя перыяды: 1) 1850-я гг. – пачатак 1920-х гг.; 2) пачатак 1920-х гг. – 1944 г.; 3) 1944 г. – сярэдзіна 1950-х гг.; 4) сярэдзіна 1950-х – канец 1960-х гг.; 5) канец 1960-х – пачатак 1990-х гг.; 6) пачатак 1990-х – па сённяшні час. У кожны перыяд краязнаўчыя музеі аказваліся запатрабаванымі, паколькі вырашалі найважнейшую задачу захавання і засваення новымі пакаленнямі гістарычнай памяці, прычым памяці родавай, мясцовай, а значыць, блізкай любому прадстаўніку мясцовай супольнасці [1; 2; 6; 12–15; 20; 22].

*2.* Краязнаўчыя музеі, у адрозненне ад музеяў іншых профільных груп, комплексна дакументуюць працэсы і з'явы, якія адбываюцца ў жыцці пэўнага рэгіёна ці населенага пункта. Яны маюць шэраг характэрных рысаў, такіх як *комплекснасць, сацыякультурная і рэгіянальная накіраванасць іх дзейнасці,* што дазваляе прапанаваць канцэптуальнае аўтарскае азначэнне краязнаўчага музея *як гістарычна абумоўленага комплекснага інстытута сацыякультурнай памяці, сродкамі якога рэалізуецца грамадская патрэба ў захаванні, інтэрпрэтацыі і актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны мясцовай супольнасці.* Краязнаўчы музей паўстае як поліфункцыянальны інстытут сацыякультурнай памяці. Дынаміка яго развіцця, дэтэрмінаваная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі фактарамі, дазваляе ўдакладніць змест яго сацыякультурных функцый і разгледзець іх на двух узроўнях. На першым – *інтрасістэмным* – узроўні сацыякультурныя функцыі краязнаўчага музея атаясамліваюцца з практычнымі кірункамі яго дзейнасці і забяспечваюць функцыянаванне самога музея як сістэмы: *дакументаванне, адукацыя і выхаванне, арганізацыя вольнага часу.* На другім, *экстрасістэмным,* узроўні мы можам вылучыць функцыі *сацыякультурнай памяці, сацыякультурнай рэфлексіі, сацыякультурнай камунікацыі, сацыякультурнай адаптацыі і сацыякультурнага праектавання,* якія вызначаюць ролю і месца музея ў сацыякультурным асяроддзі, фарміруюць сэнс яго існавання на дадзеным гістарычным этапе. Характэрнымі рысамі сацыякультурных функцый краязнаўчага музея з'яўляюцца іх канстантнасць – яны нязменныя ў розныя перыяды развіцця музея, і адначасова – дынамічнасць. У залежнасці ад сацыякультурнай сітуацыі тая ці іншая функцыя пераважае [3; 9–11; 19; 23].

3. Краязнаўчыя музеі развіваліся не толькі як месца памяці мясцовай супольнасці і інстытут захавання гісторыка-культурнай спадчыны, але як адукацыйны цэнтр рэгіёна, у межах якога і адбывалася актуалізацыя гісторыка-культурнай спадчыны праз культурна-адукацыйную дзейнасць. Яна таксама эвалюцыяніравала, што дазваляе вылучыць некалькі перыядаў у яе развіцці. Для кожнага характэрна ўласная канцэпцыя ўзаемадзеяння музея і яго аўдыторыі, абумоўленая ўяўленнямі грамадства аб прызначэнні музея і сутнасці яго дзейнасці. Культурна-адукацыйная дзейнасць краязнаўчага музея прайшла наступныя перыяды: *1850-я гг. – канец 1920-х гг.* – музей успрымаецца як асветная ўстанова – *асветная канцэпцыя* ўзаемаадносін музея і яго аўдыторыі. У гэты перыяд пачынае зараджацца практыка ўзаемадзеяння з наведвальнікамі ў форме экскурсій і, у асобных выпадках, публічных чытанняў і заняткаў на базе экспазіцый; *канец 1920-х гг. – 1960-я гг.* – музей атаясамліваецца з «палітасветкамбінатам», становіцца сродкам нагляднай ілюстрацыі палітычнай дактрыны – *прапагадысцкая канцэпцыя.* Вядучымі формамі палітыка-асветніцкай дзейнасці краязнаўчых музеяў застаюцца лекцыі і экскурсіі, да якіх дадаюцца новыя формы; *1960-я гг. – канец 1980-х гг.* – на хвалі т. зв. музейнага бума музей пачынае ўсведамляцца як месца канцэнтрацыі крыніц па розных галінах навук – *інфармацыйная канцэпцыя*. У азначаны перыяд упершыню сфармулявана ідэя аб спецыфічнасці музейнай адукацыі, а канкрэтна распаўсюджанне ведаў, што маюць прадметную аснову. Назіраецца значнае пашырэнне форм культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў. *Канец 1980-х – сённяшні час* – музей разглядаецца як сродак фарміравання каштоўнасных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны, як месца дыялогу культур – *камунікацыйная канцэпцыя*, што садзейнічае з'яўленню і распаўсюджанню інавацыйных форм уключэння гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасную культуру [5; 17; 21].

4. Характэрнымі рысамі культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея з'яўляюцца засваенне і актуалізацыя гісторыка-культурнай спадчыны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

увасобленай у музейных прадметах. Засяроджаны ў іх адукацыйны патэнцыял раскрываецца ў розных культурна-адукацыйных практыках краязнаўчых музеяў, якія разглядаюцца намі як формы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны. У складзе апошніх можна вылучыць традыцыйныя і інавацыйныя. Традыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў узніклі адначасова з самімі музеямі і эвалюцыяніравалі ў рэчышчы іх развіцця. Да такіх форм можна аднесці *экскурсіі і лекцыі, кансультацыі, навуковыя чытанні (канферэнцыі, семінары і інш.), клубы (гурткі, студыі), конкурсы (алімпіяды, віктарыны), канцэрты, кватэрнікі і інш.* Аднак істотныя змены ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці краіны, укараненне ў айчынную музейную практыку камунікацыйнага падыходу, змяненне адукацыйнай канцэпцыі краязнаўчых музеяў стымулявалі не толькі пашырэнне і паглыбленне традыцыйных форм работы краязнаўчых музеяў у межах сваіх сацыяльных функцый, але і з'яўленне інавацыйных. Сярод апошніх у практыцы рэгіянальных краязнаўчых музеяў вылучаны *музейна-педагагічныя заняткі і праграмы, майстар-класы і творчыя майстэрні, музейныя гульні, музейныя праекты (у тым ліку фестывалі і рэканструкцыі, міжмузейныя акцыі і музейныя святы).* Пералічаныя традыцыйныя і інавацыйныя формы вызначаны намі як *перспектыўныя* [4; 7; 8; 16; 18].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Фακталагічны матэрыял прадстаўленага даследавання ўключаны ў аўтарскія курсы лекцый «Музейная педагогіка», «Тэорыя і методыка музейнай справы», «Гісторыя музейнай справы», выкарыстаны пры распрацоўцы вучэбнага курса «Музеі Беларусі» па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках). Практычная значнасць атрыманых вынікаў пацвярджаецца актамі ўкаранення (ад 29.05.2017, 04.06.2018, 03.12.2018, 01.06.2020, 25.02.2021).

Высновы, сфармуляваныя ў даследаванні, могуць быць выкарыстаны пры вырашэнні актуальных тэарэтычных і практычных пытанняў музеязнаўства і сумежных дысцыплін, для прагназавання развіцця музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь і распрацоўкі канцэпцыі развіцця краязнаўчых музеяў. Прадстаўленыя ў дысертацыі палажэнні і вынікі даследавання могуць скласці тэарэтычную і фактычную аснову пры распрацоўцы вучэбных курсаў і абагульняючых прац па музеязнаўстве, краязнаўстве, рэгіяналістыцы, сацыякультурнай дзейнасці, ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных выданнях

1. Бамбешка, І. І. З гісторыі стварэння і дзейнасці першага грамадскага краязнаўчага музея Беларусі / І. І. Бамбешка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – С. 119–124.

2. Бамбешка, І. І. Гісторыя краязнаўчага часопіса «Наш край» / І. І. Бамбешка // Здабыткі : дак. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 12. – С. 271–277.

3. Бамбешка, І. І. Краязнаўчы музей: трансфармацыя дэфініцыі і зместу дзейнасці / І. І. Бамбешка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2017. – № 1. – С. 164–170.

4. Бамбешка, І. І. Інавацыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці ў практыцы рэгіянальных краязнаўчых музеяў Рэспублікі Беларусь / І. І. Бамбешка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2019. – № 2. – С. 137–148.

5. Бамбешка, І. І. Генезіс культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі / І. І. Бамбешка // Искусство и культура. – 2020. – № 2. – С. 67–71.

## Артыкулы ў навуковых зборніках

6. Бамбешка, І. І. Дынаміка развіцця краязнаўчых музеяў Беларусі ў савецкі і постсавецкі перыяд / І. І. Бамбешка // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2016. – [Вып. 10] : X Международная научно-практическая конференция, Минск, 12 мая 2016 г. – С. 119–124.

7. Бамбешка, І. І. Традыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе / І. І. Бамбешка // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2017. – [Вып. 11] : XI Международная научно-практическая конференция, Минск, 4 мая 2017 г. – С. 59–64.

8. Бамбешка, І. І. Праектная дзейнасць краязнаўчых музеяў Беларусі / І. І. Бамбешка // Гісторыка-культурная спадчына Свіслацкага краю (да 760-годдзя горада Свіслач) : 6-я Тышкев. чытанні, Свіслач, 2 верас. 2016 г. : зб. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Ін-т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 78–83.

9. Бамбешка, І. І. Спецыфіка сацыяльных функцый краязнаўчага музея / І. І. Бамбешка // Культура Беларуси: реалии современности : VII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. Году малой родины в Респ. Беларусь, Минск, 4 окт. 2018 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2018. – С. 23–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Бамбешка, І. І. Тыпалагічныя рысы краязнаўчага музея / І. І. Бамбешка // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, Белорус. гос. акад. музыки, Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2019. – [Вып. 13] : XIII Международная научно-практическая конференция, посвященная 75-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков, Минск, 16 мая 2019 г. – С. 54–60.

11. Бамбешка, І. І. Да пытання аб вызначэнні краязнаўчага музея як інстытута сацыякультурнай памяці / І. І. Бамбешка // Культура Беларуси: реалии современности : IX Междунар. науч.-прак. конф., посвящ. 45-летию учреждения образования «Белорус. гос. ун-т культуры и искусств», Минск, 8 окт. 2020 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская [и др.]. – Минск, 2020. – С. 44–47.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

12. Бамбешка, І. І. Фарміраванне краязнаўчых арганізацый на тэрыторыі Беларусі. 1917 – канец 1923 г. / І. І. Бамбешка // Романовские чтения – 2 : сб. тр. междунар. науч. конф., Могилев, 10–11 нояб. 2005 г. / Могилев. гос. ун-т, Могилев. обл. краевед. музей ; ред. совет: М. И. Вишневский (пред.) [и др.]. – Могилев, 2006. – С. 70–71.

13. Бамбешка, І. І. Пытанні гістарычнага краязнаўства на ўсебеларускіх краязнаўчых канферэнцыях і з'ездах / І. І. Бамбешка // Романовские чтения – 3 : сб. тр. Междунар. науч. конф., Могилев, 23–24 нояб. 2006 г. / Могилев. гос. ун-т, Могилев. обл. краевед. музей ; ред. совет: М. И. Вишневский (пред.) [и др.]. – Могилев, 2007. – С. 120–121.

14. Бамбешка, І. І. Да пытання аб уплывах ідэй рэгіяналізму на дзейнасць краязнаўцаў Беларусі ў 1920-я гг. / І. І. Бамбешка, А. А. Гужалоўскі // Образы прошлого в историографии: белорусско-французский диалог : материалы к междунар. науч.-практ. конф. «Историография как объект исследования», Минск–Париж, 21–22 мая 2008 г. / Междунар. гуманитар.-экон. ин-т ; редкол.: А. Н. Алпеев (пред.) [и др.]. – Минск, 2008. – С. 60–69.

15. Бамбешка, І. І. Актуалізацыя гісторыка-культурнай спадчыны Віцебшчыны сродкамі краязнаўчых музеяў у 1920–1930-х гг. / І. І. Бамбешка // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 20–21 кастр. 2011 г., 14–15 лістап. 2012 г. / Віцеб. абл. краязн. музей ; рэдкал.: Г. У. Савіцкі, В. А. Шышанаў, Н. Ю. Шаркоўская. – Мінск, 2013. – С. 224–227.

16. Бамбешка, І. І. Магчымасці патрыятычнага выхавання ў гісторыка-краязнаўчых музеях / І. І. Бамбешка // Музеі і патрыятычнае выхаванне : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістап. 2012 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.), А. М. Нароўская, Л. С. Скакун. – Мінск, 2013. – С. 44–51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Бамбешка, І. І. Асноўныя тэндэнцыі развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці рэгіянальных краязнаўчых музеяў РБ на сучасным этапе / І. І. Бамбешка // Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню: да 25-годдзя адкрыцця спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках) на гістарычным факультэце БДУ : зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27–28 чэрв. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Гужалоўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 193–199.

18. Бамбешка, І. І. Захаванне і папулярызацыя культурнай спадчыны сродкамі краязнаўчых музеяў Віцебшчыны (па матэрыялах INTERNET-крыніц) / І. І. Бамбешка // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 150-годдзю з дня нараджэння У. Г. Краснянскага, Віцебск, 17–18 кастр. 2013 г. / Віцеб. абл. краязн. музей ; рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Віцебск, 2017. – С. 232–239.

19. Бамбешка, І. І. Дзейнасць рэгіянальных краязнаўчых музеяў Рэспублікі Беларусь па рэалізацыі функцыі дакументавання / І. І. Бамбешка // Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой радзімы : зборнік матэрыялаў. У 2 т. Т. 1. / укл. : П. М. Сапоцька, Ю. В. Юшкевіч ; рэдкал.: А. М. Карлюкевіч (старшыня) і інш. – Мінск, 2020. – С. 57–61.

**Вучэбна-метадычныя матэрыялы**

20. Бамбешка, І. І. Гістарычнае краязнаўства : праграма курса для студэнтаў ФІДК па спецыяльнасці 1-23 01 12 «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; распрац. І. І. Бамбешка. – Мінск : [б. в.], 2007. – 16 с.

21. Бамбешка, І. І. Музейная педагогіка : вучэб. праграма па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейн. справа і ахова гіст.-культур. спадчыны (напрамак 1-23 01 12-03 Музеязнаўства) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: І. І. Бамбешка. – Мінск : [б. в.], 2009. – 15 с.

22. Бамбешка, І. І. Гісторыя музейнай справы : вучэб. праграма ўстановы выш. адукацыі па вучэб. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейн. справа і ахова гіст.-культур. спадчыны (па напрамках) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: І. І. Бамбешка. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 27 с.

23. Бамбешка, І. І. Тэорыя і методыка музейнай справы : вучэб. праграма ўстановы выш. адукацыі па вучэб. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейн. справа і ахова гіст.-культур. спадчыны (па напрамках) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: І. І. Бамбешка. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 24 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЗЮМЭ

## БАМБЕШКА ІВАННА ІВАНАЎНА

## КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ ПА АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Ключавыя словы:** культурна-адукацыйная дзейнасць, краязнаўчы музей, сацыякультурныя функцыі музея, гісторыка-культурная спадчына, актуалізацыя спадчыны.

**Мэта даследавання:** вызначэнне перспектыўных культурна-адукацыйных практык актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны краязнаўчымі музеямі Беларусі.

**Метады даследавання:** Дысертацыйнае даследаванне грунтуецца на культуралагічным падыходзе да феномену краязнаўчага музея і яго дзейнасці па актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Выкарыстаны агульнанавуковыя метады (аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, класіфікацыя і сістэматызацыя, статыстычны), спецыяльныя гістарычныя (гісторыка-параўнальны, гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны) і культуралагічныя (структурна-функцыянальны, культурна-гістарычны, семіятычны і аксіялагічны).

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** На падставе абагульнення дынамікі станаўлення і развіцця краязнаўчых музеяў аўтарам вылучаны і ахарактарызаваны асноўныя этапы фарміравання краязнаўчых музеяў у кантэксце сацыякультурных працэсаў. Раскрыты эвалюцыя, змест, відавая разнастайнасць краязнаўчых музеяў. Прапанавана аўтарскае вызначэнне краязнаўчага музея, акрэслены і прааналізаваны на двух узроўнях яго сацыякультурныя функцыі. Вызначаны адукацыйныя канцэпцыі ўзаемадзеяння краязнаўчага музея і яго аўдыторыі, якія разгледжаны ў гістарычнай перспектыве. Абагульнены і сістэматызаваны практычны вопыт краязнаўчых музеяў у сферы актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі культурна-адукацыйнай дзейнасці.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Палажэнні і высновы прадстаўленага даследавання могуць быць выкарыстаны пры вырашэнні актуальных тэарэтычных і практычных пытанняў музеязнаўства і сумежных дысцыплін, прагназаванні развіцця музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь, распрацоўцы канцэпцыі развіцця краязнаўчых музеяў. Фактычны матэрыял можа стаць тэарэтычнай асновай вучэбных курсаў і абагульняючых прац па музеязнаўстве, краязнаўстве, ахове гісторыка-культурнай спадчыны, сацыякультурнай дзейнасці.

**Галіна ўжывання:** музеязнаўства, тэорыя і гісторыя культуры, краязнаўства, гісторыя Беларусі, ахова гісторыка-культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЕЗЮМЕ


## БОМБЕШКО ИВАННА ИВАНОВНА

## КУЛЬТУРНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КРАЕВЕДЧЕСКИХ МУЗЕЕВ БЕЛАРУСИ ПО АКТУАЛИЗАЦИИ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ

**Ключевые слова:** культурно-образовательная деятельность, краеведческий музей, социокультурные функции музея, историко-культурное наследие, актуализация наследия.

**Цель исследования:** определение перспективных культурно-образовательных практик актуализации историко-культурного наследия краеведческими музеями Беларуси.

**Методы исследования.** В основе диссертационного исследования лежит культурологический подход к феномену краеведческого музея и его деятельности по актуализации историко-культурного наследия. Использованы общенаучные методы (анализ, синтез, индукция и дедукция, классификация и систематизация, статистический), специальные исторические (историко-сравнительный, историко-генетический, историко-типологический) и культурологические (структурно-функциональный, культурно-исторический, семиотический и аксиологический).

**Результаты исследования и их новизна.** На основе обобщения динамики становления и развития краеведческих музеев автором выделены и охарактеризованы основные этапы формирования краеведческих музеев в контексте социокультурных процессов. Раскрыты эволюция, содержание, видовое разнообразие краеведческих музеев. Предложено авторское определение краеведческого музея, обозначены и рассмотрены на двух уровнях его социокультурные функции. Определены образовательные концепции взаимодействия краеведческого музея и его аудитории, которые рассмотрены в исторической перспективе. Обобщен и систематизирован практический опыт краеведческих музеев в области актуализации историко-культурного наследия посредством культурно-образовательной деятельности.

**Рекомендации по использованию.** Положения и выводы представленного исследования могут быть использованы при решении актуальных теоретических и практических вопросов музееведения и смежных дисциплин, прогнозировании развития музейной сети Республики Беларусь, разработке концепции краеведческих музеев. Фактический материал может стать теоретической основой учебных курсов и обобщающих работ по музееведению, краеведению, охране историко-культурного наследия, социокультурной деятельности.

**Область применения:** музееведение, теория и история культуры, краеведение, история Беларуси, охрана историко-культурного наследия.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

### IVANNA BAMBESHKA

### THE CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITIES OF LOCAL HISTORY MUSEUMS OF BELARUS ON UPDATING THE HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE

**Key words:** cultural and educational activities, local history museum, socio-cultural functions of museum, historical and cultural heritage, actualization of heritage.

**The purpose of the research:** identification of promising cultural and educational practices of updating the historical and cultural heritage by local history museums of Belarus.

**The methods of the research.** The dissertation research is based on a culturological approach to the phenomenon of the local history museum and its activities to actualize the historical and cultural heritage. Both general scientific methods (analysis, synthesis, induction and deduction, classification and systematization, statistical), special historical (comparative-historical, historical-genetic, historical-typological) and culturological (structural-functional, cultural-historical method, semiotic and axiological) are used in the research.

**The results of the research and their scientific novelty.** Based on the generalization of the dynamics of the formation and development of local history museums, the author identifies and characterizes the main stages of the formation of local history museums in the context of socio-cultural processes. The evolution, content, typical diversity of local history museums are revealed. The authorial definition of the local history museum is offered; its socio-cultural functions are indicated and considered at two levels. The educational concepts of interaction between the local history museum and its audience are determined, which are considered in a historical perspective. The practical experience of local history museums in the field of actualization of the historical and cultural heritage through cultural and educational activities is generalized and systematized.

**Practical application.** The provisions and conclusions of the study presented can be used in solving topical theoretical and practical issues of museology and disciplines related, forecasting the development of the museum network of the Republic of Belarus, developing the concept of local history museums. Factual material can become the theoretical basis of training courses and generalizing works on museology, local history, and protection of historical and cultural heritage, socio-cultural activities.

**Scope**: museum science, theory and history of culture, local history, the history of Belarus, protection of historical and cultural heritage.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**БАМБЕШКА ІВАННА ІВАНАЎНА**

**КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ ПА АКТУАЛІЗАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі па спецыяльнасці
24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя
гісторыка-культурных аб'ектаў

Падпісана ў друк. 25.08.2021 г. Фармат 60х84 1/16.
Папера офісная. Надрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 1,78. Ул.-выд. арк. 1,52.
Тыраж 60 экз. Заказ №706

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск
ЛП №02330/456 ад 23.01.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ